Источник: "Родная прырода" - №4, 2017-05-18

ПРЭМ'ЕРА РУБРЫКІ

# Знакамітыя сады Сусвету

**Аўтар новай рубрыкі Аляксандр Вашчанка — чалавек, апантаны садам. Садаводства вабіла яго яшчэ з дзіцячых гадоў. Свае першыя крокі ў гэтай справе ён рабіў у невялікім садзе ля бацькоўскай сядзібы. У студэнцкія гады Аляксандру Пятровічу пашчасціла пабываць у Інстытуце садаводства, агародніцтва і бульбаводства ў Самахвалавічах. Там ён даведаўся пра перспектыўныя гатункі яблынь і груш як айчыннай, так і замежнай селекцыі і... назаўсёды "захварэў невылечнай і прыгожай хваробай, якая завецца садаводствам".**

**У сваіх матэрыялах аўтар раскажа пра гісторыю садаводства (як сусветнага, так і беларускага), пазнаёміць чытачоў з перспектыўнымі гатункамі пладовых дрэў і кустоў, а таксама айчыннымі селекцыянерамі, якія вельмі шмат робяць для таго, каб наша краіна была квітнеючым садам.**



## Эдэмскі сад



Першы сад на зямлі стварыў Гасподзь Бог. Вось што напісана пра гэта ў Кнізе Быцця:

"І пасадзіў Гасподзь Бог рай у Эдэме на ўсходзе, і змясціў там чалавека, якога стварыў.

І выгадаваў Гасподзь Бог з зямлі кожнае дрэва прыемнае з выгляду і добрае для ежы, і дрэва жыцця пасярод раю, і дрэва спазнання дабра і зла.

З Эдэма выходзіла рака на арашэнне раю; і потым раздзялялася на чатыры ракі.

Імя адной Фісон: яна абцякае ўсю зямлю Хавіла, тую, дзе золата; і золата той зямлі добрае; там бдолах і камень онікс.

Імя другой ракі Гіхон (Геон): яна абцякае ўсю зямлю Куш.

Імя трэцяй ракі Хідэкель (Тыгр): яна працякае перад Асірыяй. Чацвёртая рака Еўфрат.

І ўзяў Гасподзь Бог чалавека, якога стварыў, і пасяліў яго ў садзе Эдэмскім, каб урабляць яго і захоўваць яго..."

Прачытаўшы другі раздзел Кнігі Быцця, мы можам вызначыць прыкладнае месцазнаходжанне райскага саду, бо там гаворыцца, што ён быў размешчаны на ўсходзе побач з Асірыяй, і з яго выцякала чатыры ракі, пра дзве з якіх (Тыгр і Еўфрат) ведае зараз любы школьнік.

Але навукоўцы да гэтага часу вядуць спрэчкі пра месцазнаходжанне Эдэмскага саду. Прафесар археалогіі Юрыс Зарыншь, чые даследаванні абапіраюцца на шматлікія крыніцы і нават на касмічныя здымкі LANDSAT, "размясціў" Эдэм і райскі сад на дне Персідскага заліва, а брытанскі гісторык Дэвід Рол сцвярджае, што ён знаходзіўся ў іранскай правінцыі Азербайджан у наваколлях Тэбрыза...

Цікава таксама, плады якога дрэва з райскага саду пакаштавалі Адам і Ева. Заўважце, што Біблія не дае адказу на гэтае пытанне. Сярэднявечныя аўтары схіляліся да таго, што гэта была яблыня. Але яна даволі рэдкая на Блізкім Усходзе, і яе плады не маюць такога прыемнага смаку і водару. Магчыма, мелася на ўвазе апельсінавае, лімоннае, гранатавае альбо памяранцавае дрэва. Дарэчы, плады граната ў Бібліі часта называюцца гранатавымі яблыкамі, з іх соку рабілі і робяць адзін з самых лепшых асвяжаючых шарбетаў на Усходзе.

А якія яшчэ пладовыя дрэвы маглі расці ў Эдэмскім садзе? Практычна поўны пералік дрэў і раслін, якія ўзгадваюцца ў Бібліі, можна знайсці ў "Ілюстраванай Біблейскай энцыклапедыі", складзенай архімандрытам Нікіфарам у 1891 годзе. Паверце, што гэты пералік заняў бы шмат месца, таму давайце звернемся да аднаго з раздзелаў Бібліі — "Найвышэйшай песні Саламонавай" — у перакладзе Васіля Сёмухі:

*"Як чырвоная стужка — губы твае,*
*і любасныя твае вусны;*
*як палавінкі граната — шчочкі твае*
*пад кудзеркамі тваімі".*

Яшчэ адна цытата:

*"Зачынены сад, сястрыца, нявеста,*
*зачынены сад, запячатаная крыніца:*
*зараснікі твае — гранатавы гай*
*з сакавітымі пладамі,*
*кіперы з нардамі,*
*нард і шафран, аер і карынка,*
*расліны духмяныя, міра, альяс*
*і найлепшы бальсан".*

**Магчыма, плады граната, а не яблыні, пакаштавалі ў Эдэме Адам і Ева.**







Аляксандр Вашчанка. Эдемскі сад

Источник: "Родная прырода" - №4, 2017-05-18





Яшчэ з біблейскіх часоў пайшла цудоўная паэтычная традыцыя параўнання сваіх каханых з дрэвамі, пладамі і кветкамі. Давайце ж будзем яе падтрымліваць. Калі замест звыклага “зайка мая, рыбка мая” мы пранікнёна прашэпчам на вушка сваёй каханай: “Яблынька ты мая беларуская! Сунічка ты мая лясная! Грушка ты мая сакаўная!”, то нават калі вашы “яблынькі і сунічкі” пенсійнага ўзросту, яны ўсё роўна аддзячаць вас не менш шчырымі словамі і пачуццямі.

### Адзін з сямі цудаў свету

Другім па значнасці, велічы і прыгажосці цудам свету лічыліся вісячыя сады Семіраміды, якія былі створаны па загадзе валадара Вавілонскага царства Навухаданосара II для яго жонкі Аміціс у VI ст. да нашай эры. Не зусім зразумела, чаму яны называліся імем легендарнай асірыйскай царыцы Семіраміды, якая жыла на два стагоддзі раней.

У 614 годзе да н. э. Навуходаносар II заключае замірэнне з мідыйцамі і бярэ шлюб з іх прынцэсай Аміціс. Прынцэсу, якая вырасла ў перадгор’і, дзе было шмат дрэў і кветак, уразіў пыльны і спякотны Вавілон. Каб даказаць сваё каханне да маладой жонкі, цар загадвае пачаць будаўніцтва грандыёзнага палаца з тэрасамі для дрэў і кветак.

Чатырох’яруснае збудаванне размяшчалася на ўзвышшы, таму яно было добра бачна далёка за сценамі горада. Яго плошча проста здзіўляла, вышыня кожнай тэрасы складала 27,5 м, а сцены падтрымліваліся каменнымі калонамі. Асаблівую цікавасць выклікалі зялёныя насаджэнні на кожнай з тэрас. Для догляду за імі наверх падавалася вада, якая потым у выглядзе вадаспадаў сцякала ўніз. Да гэтага часу навукоўцы не прыйшлі да адзінай думкі, якім чынам вада трапляла на такую значную вышыню. Ёсць меркаванне, што яшчэ да Архімеда невядомы вавілонскі інжынер стварыў адмысловую помпу, якая прыводзілася ў рух намаганнямі рабоў, буйвалаў або аслоў і падавала ваду наверх. Адно вядома дакладна: у тым спякотным клімаце без эфектыўнай сістэмы арашэння не выжыла б ніводнае дрэва.

Апісанне садоў Семіраміды можна знайсці ў старажытнагрэчаскага географа Страбона: “Вісячы сад мае форму чатырохвугольніка з бакамі ў 4 плефры даўжынёй (плефр — 29,6 м); яго падтрымліваюць аркі, размешчаныя адна над другой на кубападобных цокалях. Гэтыя цокалі, полыя ўнутры, набітыя зямлёй так, што змяшчаюць у сабе вялізныя дрэвы; самі цокалі і аркі збудаваны з абпаленай цэглы і асфальту. Пад’ём на верхнія тэрасы ідзе па пакатых лесвіцах. Уздоўж іх размешчаны вінтавыя помпы, якімі бесперапынна падаюць у сад ваду з Еўфрата людзі, прыстаўленыя для гэтага”.

Можна меркаваць, што ў вісячых садах раслі фісташкавае, аліўкавае і тутавае дрэвы, груша, смоква, вінаград, міндаль, лімон, а таксама гранат, які вельмі цаніўся за плады і прыгожую, духмяную кветку. Вырошчваліся там і розныя кветкі, самымі любімымі з якіх былі ружы, лілеі і лотасы.

Незвычайныя сады здзіўлялі і ўражвалі кожнага. Уявіце сабе, што караван, які тыднямі ішоў па спякотнай пустыні, нечакана бачыў перад сабой квітнеючы аазіс! Думаю, што не толькі пагоншчыкі, але і вярблюды раскрывалі рот ад захаплення.

На вялікі жаль, ужо Страбон (63/64 г. да н. э. — 23/24 г. н. э.) бачыў гэты сусветны цуд практычна разбураным, а пазней пяскі і барханы пахавалі пад сабой некалі зялёны аазіс. Нішто не вечнае... Але ў тэраснага ландшафтнага дызайну з тае пары з’явілася шмат прыхільнікаў ва ўсім свеце, і зараз сады, кветнікі і агароды на дахах будынкаў набылі вялікую папулярнасць. Пра гэта — у наступных публікацыях.

**Аляксандр ВАШЧАНКА**





Аляксандр Вашчанка. Эдемскі сад